УДК 655.512.1:37:004.915

А. А. Акушэвіч, дац., канд. філал. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# АСАБЛІВАСЦІ РЭДАКТАРСКАГА АНАЛІЗУ АДУКАЦЫЙНЫХ ВІДЭАРОЛІКАЎ

Адукацыйны відэаролік прапаноўвае запатрабаваныя веды, садзейнічае ўдасканаленню пэўных уменняў і навыкаў, развівае прадметныя, метапрадметныя і асобасныя кампетэнцыі навучэнца. Дадзены адукацыйны прадукт можа з'яўляцца як элементам дыстанцынцыйных курсаў, так і часткай вочных вучэбных заняткаў. Значны патэнцыял і аб'ектыўныя абмежаванні выяўляюцца падчас выкарыстання адукацыйных відэаролікаў непасрэдна ў навучанні. Іх стварэнне выступае складаным, сур'ёзным і адказным працэсам, да якога варта далучаць рэдактара. Рэдактарскі аналіз відэа грунтуецца на агульнапрынятых падыходах і ўлічвае спецыфіку кантэнту. Пры падрыхтоўцы заключэння аб магчымасці публікацыі вучэбна-метадычных распрацовак мэтазгодна кансультавацца з настаўнікамі, выкладчыкамі, вучонымі і метадыстамі.

Знаёмства з адпаведнымі прадуктамі, прадстаўленымі ў адкрытым доступе, а таксама ўласны досвед работы з відэаматэрыяламі па беларускай мове і літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі дазволілі вылучыць практычныя ўзроўні рэдактарскага аналізу адукацыйных відэаролікаў. Такіх узроўняў налічваецца як мінімум шаснаццаць: 1) тэхнічны; 2) драматургічны; 3) метадычны; 4) факталагічны; 5) узровень дызайну; 6) узровень маўленчай культуры спікера; 7) узровень стылістыкі тэксту; 8) узровень арфаграфіі і пунктуацыі ў тэкставых фрагментах; 9) узровень выкарыстання табліц; 10) узровень акцёрскага майстэрства спікера; 11) узровень мантажу; 12) узровень выкарыстання ілюстрацый; 13) узровень выкарыстання мультыплікацыі; 14) узровень выкарыстання іншых відэафрагментаў; 15) узровень выкарыстання інтэрактыўных элементаў (тэстаў, гульняў ці інш.); 16) узровень аўтарскага права. Разам з тым рэдактар дадаткова звяртае ўвагу на логіку пабудовы відэатвора, на ўзаемадзеянне і дарэчнасць усіх яго эленматаў, на адпаведнасць прэзентаваных матэрыялаў узросту патэнцыйнага карыстальніка.

Такім чынам, аналіз і рэдагаванне адукацыйных відэаролікаў бачацца складаным шматузроўневым працэсам. У выніку канструктыўнага ўзаемадзеяння аўтара/аўтараў і рэдактара прагназуецца атрыманне якаснага прадукту і эканомія рэсурсаў.